Stylistyka.

Kl. VI.

M. Bžozolski

сьцісласьць, нэту гістарычнага выкладу здарэньняў ў іх прагматычнай сувязі.

Два роды аповесьці.

Мэтай аповесьці - гэта ёсьць даць паняцьце аб здарэньні або вобраз здарэньня. У першым выпадку называецца празаічнай або адарканай, ў другім выпадку вобразнай або поэтыцкай.

Постаці аповесьці.

Як поэтыцкая, так і празаічная аповесьць дзеліцца на некалькі постаці. Найважнейшая з постаці празаічнай аповесьці ёсьць: летапіс, запіскі, абонэмэры, гэографія і гісторыя.

Летапіс.

Летапісам называем выкладам здарэньняў з жыцьця нейкага народу або дзяржавы толькі ў пасьлядоўнасьці ў часе. Так што між выкладам здарэньняў часта няма

ніякай сувязі, акрамя таго, што зда-раліся ў той самы час.

Летапіс ёсьць найпрасьцейшаю постацьцю апавясьці і вытваралася ў таго ці другога народу ў першы час існаваньня пісьменнасьці. У нас быў першы летапісцам-Нэстар. +1114.

Запіскі – мэмуары.

Запіскамі або мэмуарамі называецца выклад здарэньня, у каторых аўтар сам прыймаў удзел або быў сьведкам.

Дзеля гэтага выклад здарэньняў паэта перарываецца асабістымі ўвагамі, разважаньнямі, самога аўтара. Запіскі або мэмуары вытвараліся ўжо пазьней чымся летапіс у народаў на ўжо больш культурную эпоху жыцьця народу. Да найстарэйшых мэму-араў у нашай літэратуры залічаюцца адпісы Філона Кміта і дзёньнік Эўлашэўскага.

Біографія.

Біографіяй называецца апісаньне якойнебудзь асобы жыцьця.

У біографіі патрэбна акрамя выкладу факты з жыцьця асобы. Паказаць таксама якія абставіны мелі ўплыў на інтэлектуальнае і моральнае жыцьцё асобы і якое значэньне мае ягоная грамадзкая дзейнасьць.

Вельмі важнай часткай біографіі ёсьць характэрыстыка асобы, гэта ёсьць адбіцьцё ягонае духовае прыроды і характару.

Калі нехта апісвае сваё жыцьцё, то такі твор называецца аўтобіографія.

Гісторыя.

Гісторыя ёсьць найбольш складанай і найцяжэйшай пастацьцю аповесьці.

У адношаньні да гісторыі, летапісы і мэмуары служаць толькі крыніцай, ад куль гісторыя чэрпае ведамасьці, пры чым гісторыя строга ацэнівае і крытыкуе гэтыя ведамасьці. Біографіі і характэрыстыкі гістарычных асоб, твораць толькі асобныя часткі зьместу гісторыі. У процiўленасьці да летапісу, гісторыя ў таго ці іншага народу толькі тады, калі пісьменнасьць і культура гэтага народу дасягае высокае ступені (вялікага разьвіцьця). Па водле зьместу гісторыя з летапісам мае шмат супольнага. Бо гісторыя і летапіс, выкладае зда=рэньні і факты з жыцьця пэўнага народу.

Летапіс, мэмуары й гісторыю можна разумець як розныя пастацьці аднаго агульнага паня=цьця гістарычнае аповесьці, якая у розныя пэры=оды людзкога разьвіцьця, прыймае розныя формы.

Летапіс — гісторыя, як разумеў яе чалавек пісь=менны перад 1000 гадамі, калі ён умеў толькі пі=саць, але ня было гістарычнае навукі.

Гісторыя у поўным разуменьні гэтага слова — навука, як разумее яе чалавек, які ўладае ўжо рознымі мэтодамі й спосабамі дасьледу.

Нешта сярэдняе паміж гэтымі двума разуменьнямі гісторыі, займаюць запіскі, або мэмуары.

Розьніца між гісторыяй й летапісам перад усім ёсьць тая, што гісторыя выкладае зда=рэньні ня толькі ў пасьлядоўнасьці часу (хроналё=гічнай), але й ў пасьлядоўнасьці прычыннай (праг=

матычнай), паказываючы прычыны здарэньня, яго вынікі, выкладаючы здарэньне ў шчыльнай сувязі з другімі здарэньнямі, чаго няма, як мы бачылі ў летапісе.

II. Што гісторыя выкладаючы якое небудзь здарэньне й карыстаючыся для гэтага пэўной крыніцай, павінна вельмі асьцярожна падходзіць да гэтай крыніцы, бо ў шмат якіх крыніцах, праўда часта ~~вы~~ бывае перамешана з выдумкай. Гэтай асьцярожнасьці вымагае так-званая гістарычная крытыка, якой заданьне палягае на тым, каб аддзяліць праўду ад выдумкі ў гістарычных памятках, а ніжэ іншым у гэтым самым летапісе, які зьмяшчае у сабе разам з выкладам са- праўднасьці й шмат такога, што летапісец запазычыў з народных пераказаў, зусім вераючы у іх праўдзівасьць. Такім спосабам гісторыя ёсьць пасьлядоўным выкладам ў вонкавай (хроналёгічнай) і ўнутранай (прычыннай) сувязі цэлага народу праверанных крытыкай фактаў й здарэньняў з жыцьця народаў.

Калі гісторыя апісвае жыцьцё ўсей людзкасьці, то яна завецца сусьветнай (агульнай) гісторыяй. Калі-ж апісваецца жыцьцё аднаго паасобнага народу, завецца паасобнай гісторыяй.

Значэньне стылістыкі.

Навука аб складзе мовы называецца стылістыкай. Слова стыль (лацінскае stilos азначала мэталічную палачку, якой пісалі Грэкі й Рымляне на навошчаных дошчачках). Пасьля слова стыль, азначала характар пісьма, а пасьля спосаб выражэньня думкі, або склад мовы. Стыль і склад мовы зрабіліся адназначнымі паняцьцямі. Нп. можна сказаць: склад мовы Я. Купалы або стыль Я. Купалы.

Стыль у творах мае падвойнае <u>значэньне: шырокае й вузкае.</u>

У шырокім значэньні, стыль называецца кожны склад мовы.

У вузкім разуменьні пад словам стыль, разумеем характар мовы, уласьцівы аднаму якому небудзь пісьменьніку. Нп. стыль Купалы, Коласа, Багушэвіча.

Асаблівасьці стылю кожнага пісьменьніка высьвятляецца ў гісторыі літэратуры. Агульныя законы стылю, каторым падлягаюць усе творы слоўнага мастацтва выкладаецца ў стылістыцы. Стылю ня можна мяшаць з мовай, бо мова гэта сума слоў, ужываных якімсь народам, а стыль гэта спосаб разьмяшчаньня слоў у мове. Дзеля гэтага мова толькі служыць матэр'ялам да стылю.

Мова ёсьць скарбам цэлага народу, а стыль ёсьць собкасьцьцю пісьменьніка. Дзеля гэтага ні водзін пісьменьнік не можа зьмяніць мовы, але можа зьмяніць свой стыль.

<u>Дзьве стораны мовы і стылю.</u>

Кожнае слова выражае паняцьце. Апрача таго, зьяўляецца яно гукам, які выклікае ў нас жывы вобраз, або фігуру прадмета. Гэтым чынам, слова мае дзьве <u>стораны: унутраную й вонкавую.</u>

З унутранай стораны — паняцьце якое здавальняе патрэбу нашага разуму.

З вонкавай стораны — меньш, або больш прыгожае выражэньне, здавальняючае нашае пачуцьця патрэбу. Дзеля гэтага, у стылю маем таксама дзьве <u>стораны: лёгічную й мастацкую.</u>

Лёгічную старану мовы складае яе сэнс, яе зразумеласьць.

Мастацкую — складае яе прыгожасьць.

У лёгічным адносіньні мова перадае нашу

думку, або неправільна, цёмна.

У мастацкім аднашаньні мова бывае для нас прыемнай, або не. Глядзячы, ці стройна ў ёй пастаўлены гукі, адзін за другім, ці словы мовы рысуюць вобраз прадмету.

Лёгічныя варункі стылю.

Лёгічная старана стылю, вымагае яснасьці й точнасьці. Яснасьць выражэньня выражаецца ў тым, каб мову можна-было-б разумець лёгка, свабодна, без ніякага высілку розуму.

Рымскі рытар Квінтыльян казаў, трэба старацца ~~по~~ не аб тым, каб нас кожны зразумеў, але аб тым, каб кожны не мог нас не зразумець.

Точнасьць, або дакладнасьць стылю, зьмяшчаецца у точнай ~~сх~~ акрэсьленасьці выражэньня так, каб у мове было столькі слоў, колькі ў ёй ёсьць паняцьця.

Для яснасьці выражэньня, можна ужыць некалькі слоў, замест аднаго. Для точнасьці, альбо дакладнасьці на адварот.

Так стыль якога небудзь школьнага падручніка адзначаецца больш яснасьцю, чым дакладнасьцю, бо ён прызначаны для дзяцей, не знаёмых з дадзеным прадметам. Стыль тагосамага падручніка празначанага для студэнтаў, мае больш дакладнасьці, чым яснасьці.

Прычыны няяснасьці й цёмнаты стылю.

Цёмната стылю ёсьць процілежнай да яснасьці. Цёмным стылям называецца такі склад мовы, з каторага цяжка зразумець тое, што хацеў сказаць аўтар. Хто не дакладна разумее

прадмет, аб якіх піша

Апрача гэтага, неяснасьць стылю вы-
твараюць: 1) барбарызмы — чужамоўныя
словы й звароты, якія могуць быць за-
менены роўназначнымі сваімі словамі. Нп:
гэнэрацыя — пакаленьне, экспрэсія — выраз-
ньне, казус — выпадак.

У нас ёсьць шмат такіх барбарызмаў,
якія ўвайшлі ў склад нашай мовы й без
каторых ня можна абыйсьціся. Яны ўжо
атрымалі права грамадзянства ў бела-
рускай мове. Нп. Унівэрсытэт, гімназія,
журнал, інспэктар, сабака (татарскае)
бэзмен (швэдзкае), карэта (італьянскае),
агурок (грэцкі), гарбуз (татарскае). Барба-
рызмамі называюцца таксама словы
абцуга паходжаньня — по

Тэхнічныя словы.

Тэхнічнымі словамі называем тыя, якія
прысвоеныя якой небудзь навуцы, або мас-
тацтву, а дзеля гэтага неведамыя для
агулу народу. Такімі словамі зьяўляюцца:
назовы частак складаных інструмэнтаў.
(фізычных, хімічных, музычных).

Архаізмы.

Архаізмамі называюцца прастарэлы-
я словы, якія выйшлі з ужытку.

Але ў гістарычных творах, для больш
жывога выабражэньня эпохі й характэра-
стыкі асоб, ужываюцца архаізмы.

Нэолёгізмы.

Нэолёгізмамі, называюцца новага па-
ходжаньня словы, не увайшоўшыя ў агуль-
нае ужываньне. Калі слова добра складзе-
на, то хутка здабывае сабе месца ў мове.

Вельмі часта жыцьцё вымагае тварэньня нэолёгізмаў, бо новыя паняцьці няведаныя да гэтага часу ў жыцьці

Правінцыялізмы

Правінцыялізмамі называюцца словы й выразы якой небудзь правінцыі, не ўжываных у літэратуры. (клянун).

Правінцыялізмы вельмі часта уваходзяць у літэратурную мову й ўзбагачаюць яе.

Вялікія пісьменьнікі ўжываюць ў апавяданьнях з народнага жыцьця правінцыялізмы, але так, каб не зацямнялі мовы.

У апавяданьнях з народнага жыцьця, правінцыялізмы надаюць больш праўдзівасьці й колёрызнудадзенаму жыцьцю, здарэньню.

Дакладнасьць стылю процістаўляецца недакладнасьці. Недакладным стылем называецца такі, ў якім думку аўтара разумеем адваротна й ягоныя словам прыдаем зусім іншае значэньне. Недакладнасьць стылю вытвараюць: сынонімы, омонімы, неправільнае разьмяшчэньне слоў й плеоназмы.

Сынонімы.

Сынонімамі называюцца словы, розныя формай й гукамі, але падобныя значэньнем і паказываючыя водцені аднаго й таго самага паняцьця. Нп. сьмелы, адважны, храбры. Сапраўднасьць, праўда, праўдзівасьць. Паходжаньне сынонімаў высьвятляецца тым, што адзін і тойжа прадмет вытварае свае якасьці розныя ўражаньні.

Омонімы.

Омонімамі называюцца словы, аднолькавыя формай й вымаўленьнем, але розныя значэньнем. Нп: каса, каса (валасы). Паходжаньне омонімаў высьвятляецца тым, што некалькі прадметаў й зьяваў

могуць вытварыць адно й тое самае уражаньне, дзеля гэтага атрымоўваем адзін і той самый назоў. На аломілах будуюцца каламбуры (ігра слоў, або наўмыснае выказваньне омонімаў для выказаньня вострага жарту. Нп: адзін салдат ідучы ўбай сказаў: „атрымаю за адвагу крыж (альбо надаль, альбо магільны крыж).

Неправільнае разьмяшчэньне слоў.

Неправільнае размяшчэньне слоў прычыняецца вельмі да недакладнасьці стылю. „Лекар вылячаў 30-годняга хворага." Патары кідаліся на людзей, зьвязывалі іх рукі і ногі і уцякалі з імі.

Ужываньне тых самых канчаткаў у розных склонах прычыняецца таксама да нязяснасьці стылю. „Вецер вытварае холад. Плот акружае хлеў. Цэсар затапіў карабель."

Найболей прычыняецца да недакладнасьці стылю неправільнае разьмяшчэньне знакаў прыпынку. „Абласкавіць, ня можна разстраляць. Паставіць статую, залатую ніку трымаючую. Аднаму каралевічу была абвешчана воля памёршага караля.

Плеоназмы.

Называюцца словы ужываныя ў мове без усякай патрэбы. „Малады юнак, бачыў гэта собскімі вачыма. Спусьціўшыся у ніз."

Але для большай выразнасьці зьвярнуць увагу на гэтае слова, ужываюцца плеоназмы ў гутарках і мастацкай мове: „О поле, поле, кто цябе засеяў мёртвымі касьцямі".

Мастацкія варункі стылю.

Мастацкі бок стылю вымагае ...

кальнасьці й вобразнасьці. (Эуфонія, азначае прыемнасьць, добразвучнасьць).

~~Какофонія~~ Музыкальнасьць і добразвучнасьць стылю зьяўляецца стройным, гарманічным злучэньнем слоў й ска=заў, так, каб мова была прыемнай. Немузыкальнасьць, дрэннагучнасьць — какофонія зьяўляецца зайсёды вынікам лішняга злучэньня вялікага ліку галосных (я ён і Янка) або за=шмат зычных (ці хвалілі мілену). (пры перапраўе).

Вобразнасьць стылю, залежыць ад вобразнага выражэньня думкі, так, каб думка была выражана не абстрактна, адарвана але пачуць.

Мастацкія вобразы стылю вы=нікаюць з самой прыроды мовы: у кожным слове ны част:

1). Гук голасу, які дзейнічае на слух
2). Вобраз прадмету, які дзейнічае на уяву.

Дзеля гэтага слова ўжо зьмя=шчае ў сабе мастацкага сродкі вы=ражэньня думкі: Чалавек карыста=ецца толькі гэтымі сродкамі.

Слова, пры помачы аднаго гуку й аднаго вобразу, выражае адно паняцьце, а мова пры помачы ст=ройнага злучэньня многіх гукаў й вобразаў выражае цэлую думку.

Пэрыяд.

Стыль бывае траякага роду.

a). Ударваны.
b). Пэрыядычны,
c). Мяшаны.

Адарваны стыль творыцца з ка-
роткіх, простых або складаных
сказаў у якіх вельмі мала, альбо зу-
сім няма ~~складаных~~ даданых сказаў.
(Пр. „Конь над галавой.)

Адарваная мова ~~дадзена да~~
даведзена да найбольш магчымай
кароткасьці — лаканічная мова.

Лаканічная мова азначаецца
сілаю й шматзначнасьцьцю. (Нп. мова
Цэзара. veni, vidi, vici).

Лаканічнасьцю адзначаюцца на-
пісы на памятніках.

Найбольш дасканалай формай
выражэньня думкі ёсьць пэрыяд.

Пэрыядам называецца такі сказ,
які азначаецца пашыранасьцю, закан-
чанасьцю й асаблівым, мастацкім

разьмяшчэньнем сваіх частак.

Пэрыяд — па грэцку значыць круг.

Мэтай такога мастацкага раз-
мяшчэньня слоў ёсьць тое, каб дасяг-
нуць найбольш магчымай стройна-
сьці, як у разьвіцьці думкі, так і
ў форме яе выражэньня.

З формы выражэньня вынікае му-
зыкальнасьць пэрыяда, рытм.

Грэцкі філёзоф Арыстотэль ка-
жа, што пэрыяд зьяўляецца такім
выражэньнем, якое заключае пача-
так і канец.

Пэрыяды бываюць простыя й складаныя.

Просты пэрыяд творыцца з простага
сказу. Адзначаючыся ад апошняга асабі-
вою поўнасьцьцю й закончанасьцю.

Для разьвіцьця пэрыяду даваліся нас-

ступныя пытаньні: „Хто, што, дзе, які, спосабам, калі.

Просты пэрыяд заключае ў сабе адно самастойнае разважаньне, якое разьвіваецца ў пэрыяд пры помачы паясьняльных паняцьцяў, выражаных граматычнымі часткамі, акалічнасьцямі й дапаўненьнямі, але ніколі поўнымі разважаньнямі.

Навука кіруе намі. (калі разабем ў просты пэрыяд) Навука, заўсёды мудры правадыр на шляху жыцьця, адзіны апякун людзей ў нядолі й долі, заўсёды кіруе намі да дасягненьня мэты праўдзівага духовага шчасьця.

Складаны пэрыяд.

Складаны пэрыяд творыцца з складанага сказу. З колькі-бы сказаў не складаўся складаны пэрыяд, заўсёды мае толькі дзьве галоўныя часткі, лёгічна зьвязаныя між сабою, з каторых адна зьмяшчае ў сабе думкі даказываючыя, высьвятляючыя, а другая, думкі якія трэба даказаць, высьветліць.

Адна частка — павышэньне (па лацінску — protasis — праціг) другая — паніжэньне (apodosis — адданьне).

У паніжэньні выказваецца галоўная думка, якая вымагае грунтоўнага разьвіцьця пры помачы доказаў й высьветленьня;

У павышэньні выказваюцца тыя думкі, якія служаць разьвіцьцём галоўнай думкі, або яе асновай.

Хаця нельга сумнявацца ў тым, што чытаньне ёсьць неабходным варункам у разьвіцьці чалавека (павышэньне); але без належнага кірунку і выбару кніжак яно можа стацца для чытача крыніцай цяжкіх памылак у жыцьці.

(паніжэньне).

Складаны пэрыяд зьмяшчае у сабе галоўнае разважаньне, якое разьвілося у пэрыяд другімі, высьвятляючымі разважаньнямі, выражанымі дадзенымі сказамі:

дапаўненьне, азначэньне, акалічнасьць.

Багацьце не можа ~~ушча~~ зрабіць чалавека шчасьлівым:

Багацьце, якога так многа людзі дабіваецца, ня стрымліваючыся перад ніякімі перашкодамі, ня можа зрабіць чалавека шчасьлівым,[x] таму што яно не прыносіць з сабою ні мудрасьці, ні здароўя, ні права на пашану, якія толькі могуць зрабіць чалавека задаволеным сваёй доляй, а ў выніку і шчасьлівым.

У другой частцы пэрыяда (паніжэньні) заключаецца заўсёды доказ, высьвятленьне, або вынік сказанага у першай палове (павышэньні). Цяжка знайсьці у пісьменьнікаў мову, якая складаецца толькі з самых пэрыядаў. Калі ў мове пераважаюць пэрыяды — мова пэрыядычная.

14 III. 1944г.

Стыль мяшаны.

Ніводзен літаратурны твор, ня можа быць напісаны ані адным адарваным стылем, ані адным пэрыядычным. Такая аднастайнасьць стылю, робіла б твор цяжкім і непрыемным. Дзеля гэтага, найлепш у творы ужываць стыль мяшаны, г. зн.: стыль разнастайны, гутаркі, які зьмяшчае ў сабе разнастайную і жывую зьмену сказаў кароткіх і доўгіх, простых і складаных, асобных выражэньняў і поўных пэрыядаў — так як зьвычайна родзіцца думка чалавека. Там стыль, дзе жыва і разнастайна зьмяняюцца думкі і выражаюцца то кароткімі, разнастайнымі сказамі, то складанымі, то

зноў поўнасьці пэралдані, называецца
стылем мяшаным, або разнастайным.

Мяшаны стыль азначаецца пра-
роднасьцю, прастатой, ён лёгкі і прыем-
ны для слуху. Як вырабіць стыль.

[Чытаньне твораў вялікіх пісьмень-
нікаў і вывучэньне іх стылю, зьяўляецца
найлепшым спосабам да выпрацаваньня
уласнага стылю кожнага чалавека]

Паэтыцкі стыль:

Словы служаць ня толькі для
дакладнага перададаньня паняцьця абпра-
дметах, але таксама і для жывога вы-
абражэньня гэтага прадмету.

Словы для пісьменьніка служаць тым
самым, чым ёсьць фарба для мастака.

Аўтар, пры помачы слоў рысуе жы-
выя образы перад вачыма чытача і выклікае
разнастайныя пачуцьці ў яго душы.

Хоць ўсе людзі больш або менш карыстаю-
цца вобразнай мовай, але песьняры выключна ёю
карыстаюцца. Мы ўсе ў нашай мове імкнемся да
таго, каб абстрактныя паняцьцям даць пачуць-
цёвую (конкрэтную) форму. У гэткіх спосабах мы
як-бы ажыўляем неажыўленыя прадметы. (Тупы ро-
зум. Каменнае сэрца. Мора стогне. Вецер вые).

Адсюль твораццца прыпадабненьні, параўна-
ньні і разнародныя формы замены аднаго пра-
дмета другім. Такім чынам многія словы, акрам
абазначэньня свайго собскага паняцьця, ужыва-
юцца да абазначэньня і другіх паняцьцяў. Словы і
цэлыя выражэньні ужываныя ў пераносным зна-
чэньні, называюцца тропамі (Τρόπος).

Найважнейшыя тропы: мэтафора, мэтані-
мія, сынэкдоха, іронія, алегорыя, гіпэрбала, эпітэт,
уасабленьне, параўнаньне.

Мэтафора: (μεταφορα).

— Пераняесьне, гэта такое выразьне, у каторым аднаму прадмету прыпісваецца азнакі другога, падобнага да яго. Нп. Жалезная воля, Мора стогне, Месяц шэпна. Да мэтафары адносяцца такса названьне прадмету чагочага адпаведнымі сфонасьці. Нп: „Чалавека без пачуцьця называюць каменьнем. Хітрага — ліс, Багатага — крэзус. Беднага — лазар.

Мэтафорай такса можна назваць мэтафарычным выразэньнем.

Уасабленьне.

Да мэтафары такса адносіцца уасабленьне. Будзе тады, калі на прадметы неажыўленыя, або нават на адарваныя паняцьці, пераносяцца сфонасьці і азнакі жывой істоты, чалавека.

Уасабленьне выражае як-бы жывымі, чуючымі і думаючымі неажыўленыя прадметы. Нп: Горад заснуў. Пара глядзіць на мора.

Мэтанімія.

Перамена імёня, замена паняцьця.

Пераносіць значэньня слова ад аднаго значэньня да другога ў трох, розных адносінах. Нп: а). Адношаньне прычыны. Дзейнасьць ставіцца замест прычыны і на адварот; Матэрыял замест прадмета, зробленага з гэтага матэр'ялу; Аўтар, або вытворнік, замест самого твору (Нб чыл ты сьлёзы льеш) (Запахла порахам) (Блёнула сталь).

б). Адношаньне месца.

Прадмет ставіцца замест таго, што знаходзіцца ў ім, або каля яго: Будынак — замест тых жывых людзей. Судзьдзя — замест што ў ім знаходзіцц. Прымета, вопратка, аружжа замест уласьніка. Пэўная эпоха часу замест выступаючых у ёй асобаў і здарэньняў;

Сволаеьцы або якаеьцы прадмету замест самога прадмету: Дол стужаўся. У горадзе зьявіліся мундзіры і шпора. Наш эгаістычны і бязлітасны век.

Адношаньне часу.

У прадстаўляеся становіцца замест пазьнейшага і на адварот. Нп.
Ён хутка с торбай пойдзе (зраўняецца).
Ён нам адкланяўся. Ён упаў на полі бітвы.

Сынэкдоха.

Зьмяненьне, загадка. Часта ставяць частку прадмета замест цэлага і наадварот.
Адзіночны лік замест мнохнага — " —.
Такі троп называецца сынэкдохай. Нп.
Стараньні аб хлебе. Ні кала, ні саломкі: Ніва сьпа на сонцы.

Гіпэрболя. (перабольшаньне).

Такая сынэкдоха, якая дапушчае замену меншага без параўнальна вялікшым, называецца гіпэрболяй. Нп: Кроў лілася ракой. Ён бег як страла.

Літотэс (зьменшаньне).

Такая сынэкдоха, што дапушчае замену вялікшага беспараўнальна меншым, называецца літотэсам. Нп. Абірае да ніткі.

Алегорыя. (іншасказ).

Калі мы прадмет або зьяву апісваем адзнакамі другога прадмету або зьяву, то такое апісаньне называецца алегорыяй. У поэзіі, алегорыя завецца пашыранай мэтафорай. Пераноснае значэньне тут пашыраецца на цэлую думку, або на некалькі зьмешчаных у адным творы думак, так, што прыказка, загадка, прыпавесьць, або вершы, бываюць алегарычнымі. Нп. Кветка папараці.

Іронія (насьмешка).

Пераняесеньне слоў ад аднаго паняцьця

да другога, праціўленага з гэтай на=
сьмешкі з іх называецца іроніяй.

Гэта спакойнае, стрыманае насьме=
ханьне. Калі штонебудзь адмоўнае уз=
ноецца добрым ці нават хваліцца. Ду=
рное, разумным. Дробнае буйным.

У іроніі насьмешліва выказываецца на=
ваеньні словамі зусім праціўленае та=
му, што думаецца аб ім. Нп: Нікага пазы=
ваюць вяліканым.

Сарказм. (мучаю).

Сарказмам называецца больш ядавітая
іронія. Нп.

А людзі глянуўшы на сонца,